**СТАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ КРЫТЫКІ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА XX–XXI СТСТ. ДА РЭЛІГІЙНАГА АСПЕКТУ Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

***Лонскі А.П.,***
*студэнт 3-га курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Падстаўленка В.Ф.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

На працягу ўсяго існавання беларускай літаратуры яна была неадрыўна звязана з рэлігіяй, шырока апелявала да адпаведных вобразаў і матываў. Многія айчынныя пісьменнікі, пачынаючы ад Дуніна-Марцінкевіча, Каліноўскага, Купалы і Коласа, актыўна цікавіліся рэлігійнымі з'явамі ў сваіх творах. Такая традыцыя захоўваецца і ў сучаснасці.

Мэта артыкула: выявіць спецыфіку адносін айчыннага літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі да духоўна-рэлігійных фактаў у нацыянальнай творчай спадчыне.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў артыкуле паслужылі артыкулы і кнігі беларускіх навукоўцаў, якія займаліся распрацоўкай дадзенай тэмы. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага і структурна-тыпалагічнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** З пачаткам савецкага перыяду ў гісторыі Беларусі рэлігія пачала рабіцца табуяванай тэмай як у самой літаратуры, так і ў літаратуразнаўстве і літаратурнай крытыцы. У 1924 годзе ў перыяд свайго перавыдання зборнікі Янкі Купалы "Жалейка" і "Гусляр" зноў сталі аб'ектам пільнай увагі савецкіх цэнзараў. З іх Галоўлітбел выкрасліў усе радкі, якія змяшчалі словы "Бог", "малітва", "крыж", "царква", "неба" [3, 83–84]. З рэдакцыі паэмы "Сымон-музыка" 1925 г. таксама пад ціскам цэнзараў зніклі ці заменены радкі са словамі "Бог", "святы", "крыж", "царква" і г.д. [3, 85-86]. За "упадніцкі" і рэлігійны змест забаранялі публікацыі вершаў Максіма Гарэцкага ("Памінкі"), Тодара Кляшторнага ("Вершы аб Вільні") [3, 89] і іншых аўтараў. Выданне дарэвалюцыйных твораў мусілі праходзіць новую цэнзуру і выдавацца з прыпіскамі, дзе "будзе патлумачана, калі жыў аўтар і чаму яго вершы карысныя для сялянства" [3, 90]. Фактычна можна казаць аб гвалтоўным выкіданні з літаратуры рэлігійнага аспекту, які заўсёдна граў у ёй істотныя ролі. У літаратуразнаўстве і літаратурнай крытыцы рэлігійнае амаль не апісвалася, хіба што ў негатыўным плане.

У пасляваенныя гады назіралася пэўная лібералізацыя, але нават спасылаючыся на асобныя элементы рэлігійнага ў літаратурным мастацтве таго часу (загаловак зборніка М. Танка "Хай будзе святло", раман У. Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" і яго ж верш "На Беларусі Бог жыве", аповесці-прытчы В.Быкава), многія сучасныя даследчыкі пішуць аб наяўнасці і ў гэты "час асляплення бязбожніцтвам, занядбання традыцый хрысціянскай культуры" [2, 203]. Хоць тады і сустракаліся некаторыя алюзіі і біблейскія падтэксты, але іх малая колькасць і руплівая зашыфраванасць не дазваляюць казаць аб паўнацэнным функцыянаванні тагачаснага рэлігійнага складніка ў беларускай літаратуры.

Толькі з распадам Савецкага Саюза і скасаваннем Галоўліта рэлігійная тэматыка поўнасцю вярнулася ў наша слоўнае мастацтва. У многіх аўтараў рэлігійнае з перыферыі выходзіць на першы план. Пачынае пісаць і выдавацца Алег Бэмбель (Зьніч), выходзяць кнігі Рыгора Барадуліна, поўнасцю прысвечаныя хрысціянскім сюжэтам ("Евангелле ад мамы", "Ксты"), Данута Бічэль ("Стакроткі ў вяночак Божай Маці") і іншыя. Адначасова ў літаратуразнаўстве і літаратурнай крытыцы становяцца як ніколі актуальным даследаванне рэлігійнага аспекта як у сучасных аўтараў, так і творцаў мінулых гадоў. Напрыклад, у 2010-м годзе пабачыла свет манаграфія Сяргея Кавалёва "Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу", дзе ўпершыню сістэматычна апісвалася паэзія таго перыяду, у тым ліку яе рэлігійны аспект.

Вялікую важнасць у гэтых адносінах мае праца Ігара Запрудскага "Евангелле ад Мацея, або Таямніцы творчасці Францішка Багушэвіча". Прадстаўлены аналіз спадчыны класіка часткова перакрэслівае традыцыйнае ўспрыманне Багушэвіча як паэта-рэаліста. У прыватнасці, было слушна выяўлена, што ў сваіх вершах Багушэвіч шырока звяртаецца да біблейных сюжэтаў. У праграмным вершы "Мая дудка" лірычны герой робіць "радасную дудку" і спрабуе на ёй граць, але вынік яго не задавальняе. Тады герой спрабуе зрабіць



Репозиторий ВГУ

“смутную жалейку”, грäць на якой яму ўжо прыемней. Верагодна, што крыніцай сюжэта і кампазіцыі верша паслужыў наступны ўрывак “Святога дабравесця паводле Матфея”: “Да каго ж прыпадобню род гэты? Падобны ён да дзяцей, якія сядзяць на рынку і, звяртаючыся да іншых, кажуць: “мы гралі вам на жалейцы, а вы не скакалі; мы спявалі вам песні журботныя, а вы не галасілі” (Мф. XI, 16–17) [1, 25]. Сюжэты шмат якіх іншых вершаў Багушэвіча таксама маюць біблійныя карані.

Вывучэннем рэлігійнага аспекта ў творчасці Максіма Багдановіча займалася Г.В. Сініла. На яе думку, менавіта рэцэпцыя Багдановічам біблейскіх тэкстаў дазволіла яму ўпершыню даць арганічны сінтэз уласнабеларускіх (кніжных і фальклорных), рускіх і заходнееўрапейскіх традыцый, што спрыяла ўвядзенню нацыянальнай паэзіі ў кантэкст сусветнай [4, 316].

Агульных жа даследаванняў аб рэлігійным аспекце ў беларускай літаратуры надзвычай мала. Найбольш важнымі і грунтоўнымі з іх бачацца працы Уладзіміра Конана. У артыкуле “Біблейскія і хрысціянскія матывы ў беларускай літаратурнай традыцыі” [5] ён прыводзіць кароткі аналіз адлюстравання рэлігійнага ў беларускай літаратуры. Яшчэ больш актуальнай можна лічыць працу Наталлі Лысовай “Рэлігійныя вобразы ў сучаснай беларускай літаратуры. Спроба тыпалагізацыі”. У ёй даследчыца не толькі характарызуе творчасць Рыгора Барадуліна, Людмілы Рублеўскай, Алеся Разанава, Алега Бэмбеля і інш., але і прапануе класіфікацыю літаратуры паводле ролі ў ёй рэлігійных вобразаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, у савецкія часы з прычыны ідэалагічнага ціску на рэлігію і ўсё звязанае з ёй адпаведныя даследаванні нацыянальнай літаратуры амаль не праводзіліся. Апроч таго літаратурная цэнзура пільна сачыла за тым, каб аўтары не праводзілі “рэлігійную прапаганду”. Нават творы дарэвалюцыйных пісьменнікаў амаль не вывучаліся з рэлігійнага пункту гледжання. У наш час гэтай справай плённа займаюцца такія навукоўцы, як І. Запрудскі, Г. Сініла, Е. Лявонава, С. Кавалёў і іншыя.


1. Запрудскі, І. Евангелле ад Мацея, або Таямніцы творчасці Францішка Багушэвіча / І. Запрудскі // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры Белдзяржуніверсітэта: Навуковы зборнік. Выпуск першы. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 21–31.
2. Синило, Г.В. Диалог с Богом и полилог культур как один из важнейших факторов становления и развития религиозно-духовной и художественной культуры Беларуси / Г.В. Синило // Труды факультета международных отношений. Научный сборник. Выпуск 1. – М.: «Тесей», 2010. – С. 200–204.
3. Гужалоўскі, А. Чырвоны аловак: нарысы па гісторыі цэнзуры ў БССР. У 2 кн. Кн. 1: 1919–1941 гг. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: Рэдакцыя газеты “Звязда”, 2012. – 304 с.
4. Сініла, Г. В. Біблейскае паданне пра патоп у асэнсаванні Максіма Багдановіча / Г. В. Сініла // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: матэрыялы X Міжнар. навук. канф. (Мінск, 6–8 кастрычніка 2011 г.) / пад агул. рэд. І. А. Чароты. Мінск: Выд. Цэнтр БДУ, 2011. – С. 315–320.
5. Конан, У. Біблейскія і хрысціянскія матывы ў беларускай літаратурнай традыцыі / У. Конан // Наша вера. – 1999. – № 4. – С. 19.


## СПОСАБЫ ПРЫЦЯГНЕННЯ ЎВАГІ ЧЫТАЧА ДА ПУБЛІКАЦЫІ: ВЫНІКІ ЭКСПЕРЫМЕНТА


***Лукашова Л.В.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Семянькова Г.К.,** канд. філал. навук, дацэнт*


Падчас працы над навуковай тэмай “Прагматыка сучаснага публіцыстычнага тэксту (на матэрыяле беларускамоўнага перыядычнага друку)” намі была зроблена спроба выяўлення эфектыўных спосабаў прыцягнення чытацкай увагі да зместу журналісцкага артыкула, а таксама класіфікацыі загалоўкаў тэкстаў перыядычнага друку ў псіхалінгвістычным аспекце (на аснове эмоцый і пачуццяў, якія ўзнікаюць у свядомасці адрасата пры першасным азнаямленні з назвай журналісцкага твора). Для дасягнення пастаўленай мэты была складзена анкета, якую мы прапанавалі запоўніць студэнтам розных факультэтаў установы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Анкета змяшчала два блокі пытанняў: у першым было прапанавана ацаніць удаласць і цікавасць загалоўка, у другім – падзяліць загалоўкі на групы ў адпаведнасці з эмацыйным фонам, які яны ствараюць.



Рэпазіторый ВДУ